Спажывец

# РЫБЫ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

## Арганізаваная рыбалка спрыяе развіццю турызму

**Па даных Мінсельгасхарча, у нашай краіне спажыванне рыбы складае 14-15 кілаграмаў на душу насельніцтва. Пры гэтым айчыннай прэснаводнай рыбы сярэднестатыстычны беларус з'ядае крыху больш чым два кілаграмы. Гэта значыць, што краіна здольная поўнасцю забяспечваць сябе прэснаводнай рыбай, заявіла намеснік начальніка ўпраўлення прамысловай жывёлагадоўлі і рыбагаспадарчай дзейнасці Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Вольга БАРЭЙША.**

### ФАРЭЛЬ І КРЭВЕТКА

Паводле яе слоў, летась у краіну завезлі 185 тысяч тон рыбы і морапрадуктаў. Гэта крыху больш (на 10 тысяч тон), чым годам раней. Беларусь — не марская дзяржава, таму марскую рыбу мы імпартуем з Расіі. Наша краіна паляпшае ўзаемадзеянне з самымі далёкімі яе рэгіёнамі, напрыклад праводзяцца перагаворы з Камчаткай.

«Беларусь па-ранейшаму імпартуе морапрадукты, хоць цяпер мы працуем над законам аб аквакультуры. Магчыма, праз пару гадоў вы зможаце купіць праслаўтую беларускую крэветку», — адзначыла Вольга Барэйша.

Прадстаўнік аграрнага ведамства дадала, што ёсць і зваротны працэс. Прадукцыя айчынных рыбгасаў адгружаецца за мяжу, няхай і ў невялікіх аб'ёмах — па 1000—2000 тон. Тут можна адзначыць тры арганізацыі: фарэлевая гаспадарка з Быхаўскага раёна, вядомыя рыбгасы з Брэсцкай і Мінскай абласцей (гэта рэсурсы фарэлевай гаспадаркі «Лохва», вопытнага рыбгаса «Сялец» Бярозаўскага раёна, рыбгаса «Волма» Чэрвеньскага раёна).

«Напрыклад, прадпрыемства «Лохва» — асноўны вытворца стронгі ў Беларусі. У яго ёсць рыбагадавальнік па вытворчасці малявак, і гаспадарка экспартуе яе ў рэгіёны Расійскай Федэрацыі. У Расіі ў асноўным развіты промысел дзікай рыбы. Напрыклад, летась там здабылі рэкордныя 5,3 мільёна тон рыбных рэсурсаў з мораў. Пры гэтым у краіне доўгі час не надавалі ўвагі штучнаму вырошчванню рыбы. У нашых суседзяў не так шмат рыбагадавальнікаў, і многія рэгіёны маюць патрэбу ў іх прадукцыі. Таму малявкі стронгі мы экспартавалі нават у Карэлію, дзе гэтая рыба водзіцца ў рэках. А ў вытворцы з Бярозаўскага раёна шмат хто хоча купіць малявкі раслінаедных відаў рыбы», — удакладніла Вольга Барэйша.

### ПРАДУКТ БЕЗ ЗАМАРОЗКІ

Летась у вадаёмах краіны вылавілі 15,1 тысячы тон рыбы, з іх на прамысловы ўлоў прыйшлося 56,4 %.

А 16 дзяржаўных рыбгасаў летась вырабілі 10 580 тон рыбы, дзе прыбаўка да аб'ёмаў леташняга года склала 10 %. У гэтым сезоне перад імі стаіць больш сур'ёзная задача — нарасціць вытворчасць на 21 %, лічыць **намеснік генеральнага дырэктара «Белводгаса» Дзяніс ЗАЯЦ**.

Сёлета зарыбленне вадаёмаў практычна завершана. Раней у рыбгасах ужо прыступілі да кармлення, але прыпыніла яго дрэнная надвор'е. Спецыялісты чакаюць цяпла і спадзяюцца, што змогуць аднавіць працэс у пачатку мая. Для добрага «ўраджаю» рыбы 2024 года прадпрыемствам спатрэбіцца 30 тысяч тон камбікармоў.

У вадаёмах рыбгасаў самая папулярная рыба — карп, яна ж самая даступная, бюджэтная прадукцыя для насельніцтва. У крамах яна прадаецца менш чым за 10 рублёў. Шмат на гэтай рыбе не заробіш, але падымаць цэны вытворцы не збіраюцца.



«Рэнтабельнасць рэалізацыі рыбы ў нас мінімальная: не больш за 5-6 % у асобных арганізацыях і да 3 % у сярэднім па галіне, — удакладняе прадстаўнік «Белводгаса». — Гэта тлумачыцца не толькі канкурэнцыяй з таварамі іншых груп (свінінай, ялавічынай, курыцай). 2023 год стаў рэкордным па здабычы рыбных рэсурсаў у Расіі, і мы бачым, што суседзі арыентуюцца не толькі на ўнутраны рынак, але і на нас. Кошт асобных пазіцый, у тым ліку чырвонай рыбы, быў імі зніжаны. Таму павышэнне цэн не прывядзе ні да чаго добрага — толькі да памяншэння аб'ёмаў вытворчасці».

Хоць наш карп — свежая рыба, якая не падвяргаецца замарозцы, яна валодае сваімі смакавымі якасцямі і карысным ўласцівасцямі. А пляцо дастаўкі, асабліва з далёкіх рэгіёнаў заходняй суседкі, не можа не аказваць уплыву на густ і якасць прадукцыі. Таму ў нас на рынку застаюцца спажыўцы, якія аддаюць перавагу менавіта жывой рыбе.

Дарэчы, амаль 70 % улову рыбы ў штучных вадаёмах займае карп. За 2023 год яго вылаўлена звыш 5,5 тысячы тон. З іншых відаў рыбы — 552,8 тоны прамысловага ўлову ў штучных вадаёмах прыходзіцца на таўсталобікаў, 402,5 тоны — на ласосевых, 314,3 тоны — на амура, 37,8 тоны — на асятровых і 23,4 тоны — на сомавых.

За мінулы год арганізацыі, якія ажыццяўляюць рыбагаспадарчую дзейнасць, рэалізавалі 7,2 тысячы тон рыбы. Работнікам і насельніцтву рэалізавана 3 тысячы тон рыбы (41,5 % ад агульнага аб'ёму продажу), арганізацыям, якія ажыццяўляюць гандаль, — 2 тысячы тон (28,3 %), а астатнія 1,6 тысячы тон (22,2 %) былі накіраваны на перапрацоўку.

### ЧОРНАЯ ІКРА ЎЛАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

Няглядзячы на значны патэнцыял, чакаць, што Беларусь стане «фарэлевай» краінай, усё ж такі не даводзіцца. Вытворчасцю рыбы прэміум-класа ў краіне займаюцца сем індустрыяльных комплексаў, а аб'ёмы трымаюцца на ўзроўні 600—800 тон. З іх каля 80 % прыпадае на фарэль. Асятровыя валодаюць экспартным патэнцыялам, але попыт на мяса асятра не такі вялікі, як хацелася б, дадаюць прадстаўнікі Мінсельгасхарча.

«Фарэль і асятровыя лічацца прэміяльнай прадукцыяй, паколькі іх вырошчванне патрабуе вялікіх выдаткаў, адпаведна, сабекошт і кошт рэалізацыі вышэй. Але пры гэтым сегмент пакупніцкага рынку, які можа дазволіць сабе такую прадукцыю, аб'ектыўна менш.

Таму ў нас аб'ёмы вытворчасці рыбы вызначаюцца магчымасцямі яе рэалізацыі. Можна вырасціць і больш, але ўнутраны рынак яе не возьме, а на знешніх рынках досыць высокая канкурэнцыя. Па гэтай прычыне вытворцы асятровых рыб ідуць не па мясным кірунку (асятрына — гэта прадукт абмежаванага попыту і тэрытарыяльна прывязаны), а хутчэй нацэлены на атрыманне чорнай ікры. Вядомыя беларускія кампаніі, якія гандлююць рыбай, яе рэалізуюць, няхай і ў невялікіх аб'ёмах — тону-паўтары ў год. Пры гэтым унутраныя патрэбы ў чорнай ікры вылічаюцца нават не тонамі, а ўсяго толькі дзясяткамі або сотнямі кілаграмаў, — растлумачыў **намеснік дырэктара Інстытута рыбнай гаспадаркі Уладзімір КАСТАУСАЎ**.

### СЕЗОН АДКРЫТЫ

Вольга Барэйша адзначыла, што сфера паслуг, звязаных з рыбалоўствам, стала развівацца з 2005 годзе, калі быў прыняты Указ № 580 аб правілах вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, якім прадугледжана арганізацыя платнага аматарскага рыбалоўства — комплекс мерапрыемстваў, у тым ліку звязаных з рэалізацыяй пуцёвак.

«Гэтая тэма дасягнула свайго піку ў 2015 годзе, калі мы на заканадаўчым узроўні ўвялі тэрмін «Рыбаводства ў рэкрэацыйных мэтах». На сажалках і ў абводненых кар'ерах стала магчымым афіцыйна аказваць паслугі па лоўлі рыбы аматарскімі прыладамі рыбалоўства. Адрозненне заключалася ў тым, што ў арэнду падаваліся штучныя водныя аб'екты, дзе ў 90 % выпадкаў рыба не вырошчвалася, а працаваў прынцып «запуск-вылаў» на выхадных. Аказанне паслуг арандатарам магчыма толькі пасля падпісання акта аб стварэнні спрыяльных умоў», — расказала Вольга Барэйша.

У 2022 годзе ўведзена норма, што акт аб стварэнні спрыяльных умоў павінен пацвярджацца раз на тры гады. Такіх вадаёмаў, на якіх арганізоўваецца фактычна платная рыбалка, цяпер у краіне больш як пяцьсот, і гэты кірунак будзе развівацца і далей. «Яно спрыяе развіццю ўнутранага турызму, і мы стараемся выслухоўваць грамадзян, а таксама рэгуляваць усе пытанні на ўзроўні заканадаўства», — падкрэсліла спецыяліст.

Дарэчы, беларускія рыбгасы ўжо адкрылі рыбалоўны сезон. Паслугі платнай рыбалкі прапануюць аматарам 11 з 16 рыбаводных арганізацый. Як правіла, сезон платнай рыбалкі ў нас у краіне доўжыцца паўгода — з 1 красавіка да 1 кастрычніка. Гэта добрая дапамога для рыбгасаў: асобныя арганізацыі цалкам закрываюць фонд заработнай платы з выручаных такім чынам сродкаў. «Летась усе прадпрыемствы ўклалі ў скарбонку амаль 1 мільён рублёў. Гэта, вядома, крыху менш за 5 % ад усёй атрыманай выручкі. Аднак пералік паслуг трэба пашыраць. Попыт ёсць — значыць, павінна быць і прапанова, — паведаміў прадстаўнік «Белводгаса» Дзяніс Заяц.

Ён удакладніў, што асобныя прадпрыемствы прапануюць паслугі не толькі рыбнай лоўлі, але і вольнага часу для сем'яў рыбакоў, арэнду мангала і альтанкі. У некаторых рыбгасах можна зняць жыллё з усімі выгодамі альбо застацца з палаткай на начную рыбалку.

«Паслугі нашых рыбгасаў недарагія. Кошт аднаго квітка часцей за ўсё ад 30 да 50 рублёў, ён уключае магчымасць вылаву да пяці кілаграмаў рыбы. Калі рыбак жадае забраць большы ўлоў, то і 10, і 20 кілаграмаў можна выкупіць за асобную плату — прэйскурант устаноўлены ў кожным рыбгасе. Сезон платнай рыбалкі ўжо адкрыўся. Мы зрабілі зарыбленне, па меры неабходнасці будзем яго паўтараць — з уловам з'едзе кожны, — запэўніў Дзяніс Заяц.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Неасабісты суб'ектыў



# Пра час і пра нас

## Што расказаць пятнаццацігадоваму чалавеку

НЯДАЎНА адна пятнаццацігадовая дзяўчына, якая падумвае пра тое, каб стаць журналістам, спытала ў мяне, якая была мая першая сур'ёзная публікацыя. Пакапаўшыся ў памяці, я пачала ёй расказваць гісторыю пра чалавека, які ў сорак два гады моцна захварэў — адмовілі ныркі. І яму ў нашай 4-й бальніцы ў Мінску зрабілі перасадку. Зрабілі ўдала, але тут з'явілася новая праблема: каб чужы орган прыжыўся, трэба, асабліва напачатку, прымаць спецыяльныя лекі. Якія дзяржава закупляла недзе за мяжой. Але чыноўнікі з Міністэрства аховы здароўя грошы, выдаткаваныя на гэтыя мэты, патрацілі на... мільён апраў для акуляраў. І развялі рукамі: больш сродкаў няма. Урачы, якія рабілі аперацыю па перасадцы, абабілі ўсе парогі, каб выратаваць свайго пацыента (дакладней, пацыентаў). Але ўсюды атрымалі адказ: грошай няма. Людзі з перасаджанымі ныркамі ішлі да дактароў з надзеяй, а тыя хавалі вочы: яны нічым не маглі дапамагчы, яны ведалі, якая пакутлівая смерць чакае тых, каго яны ратавалі. Мужчына паміраць вельмі не хацеў, ён хацеў убачыць, як вырастуць яго дочкі. І звярнуўся да сваёй стрыечнай пляменніцы, якая вучылася толькі на другім курсе журфака, але амбіцыйна ўсім заяўляла: "Я журналіст..."

«Звязда» тады апублікавала маю першую спробу пяра. Мільён апраў замест жыццёва важных лекаў нават вынеслі ў загаловак. Зрэшты, сенсацыі ў гэтым не было: апраўы тыя прадаваліся ў камерцыйных аптэках па амаль завоблачных цэнах, а чыноўнікі міністэрства з гонарам расказвалі ў інтэрв'ю, якое добра яны зрабілі людзям. Матэрыял, змешчаны ў рэспубліканскай газеце, меў рэзананс, і хутка грошы на лекі аднекуль знайшліся. Мой дзядзька пражыў яшчэ дваццаць з лішнім гадоў, паўдаваў дачок замуж, пацешыўся з унукаў...

ДЗЯЎЧЫНКА, выслухаўшы гэту гісторыю, задала мне пытанні, якіх я зусім не чакала. Напрыклад, чаму аперацыю па перасадцы рабілі ў звычайнай бальніцы, а не ў Цэнтры трансплантологіі? Ці як маглі чыноўнікі з міністэрства вось так усіх падмануць і чаму ім за гэта нічога не было? Я спрабавала адказаць проста: маўляў, гэта ж быў 92-гі год. Але ўбачыла ў вачах абсалютнае неразуменне. Яны, пятнаццацігадовыя (дый старэйшыя за іх на пяць, дзесяць, нават дваццаць гадоў), гэтага проста не ведаюць. А мы ім не расказваем, нібы саромеемся. Хаця, напэўна, варта было б.

НАПРЫКЛАД, пра тое, як збіваліся з ног пасля заняткаў, каб купіць хоць што з прадуктаў. Пра вялізныя чэргі ў каўбасныя і малочныя аддзелы. Пра хлеб, намазаны маргарынам, — масла было не дастаць. Пра тое, як, атрымаўшы стыпендыю, беглі тут жа ў кіёск абмену валют (адзін з іх стаяў акурат каля мастацкага музея), куплялі на ўсе «зайчыкі» долары (атрымлівалася, калі стыпендыя павышаная, ажно дзесяць!), каб назаўтра здаць долар ці два па значна вышэйшым курсе і купіць лішні батон ці пачак маянэзу. Пра тое, як нашы мамы перадавалі адна адной рэцэпт «ну вельмі смачных катлет»: у аўсяныя шматкі дадаць разведзены ў вадзе кубік заморскага цуд-булёну «галіна бланка». І мы елі гэтыя «катлеты», у якіх не было ні грама фаршу, і яны сапраўды здаваліся смачнымі. Пра тое, як бабуля ў гастраноме прасіла прадаць ёй адно яйка — на больш у яе не было грошай. Пра набітыя цесныя аўтобусы з дачнікамі — людзі карміліся з зямлі, а машыны лічыліся раскошай.

ПРА даўгабуд у цэнтры Мінска на Кастрычніцкай плошчы, агароджаны бетоннай сцяной, за якой не было і намёку на тое, што нейкія работы калісьці будуць весціся. Пра «браткоў» у зялёных і фіялетавых спартыўных касцюмах, з залатымі ланцугамі на шыях, якія паўсюль хадзілі гаспадарамі. Пра спірт «Раял» у літровых бутэльках, які прадаваўся на кожным кроку, літаральна ў «камках» на вуліцы. Пра стойкі пах ацэтону на калідоры ўніверсітэцкага інтэрната — наркотыкі варылі проста на кухні, асабліва не хаваючыся, і нікому да гэтага не было справы. Пра сектантаў, якія чапляліся на вуліцы, нахабна тыцкалі ў рукі нейкія кніжкі, завабівалі на вячэру (і некаторыя ішлі, бо там сапраўды кармілі). Пра «шапачнікаў» — тых, хто з галавы ў людзей зрываў футравыя шапкі, і «сапожнікаў» — яны дзейнічалі ў плацкартных вагонах цягнікоў, крадучы абутак, які людзі, кладучыся спаць, пакідалі на падлозе. Іх вельмі рэдка шукалі, а ашчэ радзей — знаходзілі...

ПРА гэта адчуванне безнадзейнасці, якога, калі табе дваццаць, увогуле быць не павінна. А яно часам апаноўвала, асабліва калі задумваўся аб тым, дзе ты будзеш жыць, калі скончыш універсітэт. Аб тым, каб займець сваё жыллё, нават думкі не было. Каб проста застацца ў Мінску, трэба было мець прапіску, і каштавала яна пяцьсот долараў (пры добрай зарплаце пяцьдзясят). Пра тое, як мы, дваццацігадовыя, з нейкім бадзёрым адчаем цытавалі ў сваёй «інтэлігенцкай» тусоўцы вырванае з Лермантава: «Печально я гляжу на наше поколенье! Его грядущее иль пусто, иль темно...» — і прызнавалі гэта дэвізам свайго існавання...

Канешне, былі ў тых «ліхіх 90-х» і радасць, і каханне, і прыемныя падзеі. Бо гэта было — жыццё, якое ніколі не саткана толькі са святла ці з суцэльнай цемры. Але вось жа, калі і хочацца вярнуцца ў той час, дык толькі па адной-адзінай прычыне: тады была трава зялянейшая і вада макрэйшая, бо ты сам быў на трыццаць гадоў маладзейшы. Толькі вось па гэтай адзінай прычыне...

Я К расказаць гэта пятнаццацігадовым (дый старэйшым)? Каб разумелі, каб ведалі, каб цанілі? Давайце спачатку хаця б пачнём. А там, можа, і атрымаецца.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**